## У ХІМІЧНАЙ ЛАБАРАТОРЫІ



У кабінетах, чытальных залах, лабараторыях — усюды кіпіць напружаная падрыхтоўка да экзаменаў. Ды гэта і зразумела. Кожны імкнецца цяпер нагнаць упушчанае, замацаваць на практыцы пройдзены матэрыял, каб закончыць семестр толькі з добрымі і выдатнымі адзнакамі.

...Вось адна з хімічных лабараторый. Сёння тут студэнты IV курса праходзяць практыку па хімічнай тэхналогіі. На століках расстаўлены прылады, шклянкі з хімічнымі рэчывамі. І хоць практычныя заняткі—справа добра вядомая кожнаму, але сёння студэнты штосьці крыху хвалююцца, робяць усё з нейкай надзвычайнай асцярожнасцю: практычныя заняткі па аналітычнай хіміі сёння ўпершыню.

...Над прыладай схіліўся Іван Ускоў. Ён атрымлівае ёдаформ электралітычным спосабам. Нялёгкая гэта справа, але Ускоў не адступае. Вочы юнака пільна сочаць за ходам рэакцыі. Ён зрэдку паглядвае на гадзіннік—восьвось павінна пачацца выдзяленне ёдаформа. Ускоў спрытна перастаўляе прабіркі, яшчэ і яшчэ раз правярае тэмпературу. І вось, нарэшце, жаданая хвіліна настала. Лёгкія бурбалкі забегалі на паверхні вадкасці, а ўслед за імі пачынае выдзяляцца крышталічнае рэчыва жоўтага колеру. Дослед, аднак, яшчэ не закончан. Ускоў прывычным рухам рукі падключае апарат Кіпа, адкуль у шклянку з вадкасцю будзе падавацца вуглекіслы газ. Юнак паварочвае кранік, але, моршчачыся, зноў закрывае яго. Маленькая няўдача... Аднак студэнт упарта прадаўжае справу. Ён з нецярплівасцю паглядае на гадзіннік. Штосьці вельмі доўга цягнецца мінута.

— Няўжо так нічога і не атрымаецца?, — думае ён.— Няўжо дзе памыліўся?

Яшчэ з мінуту ён напружана сочыць за ходам рэакцыі, потым паварачвае выключальнік і задаволена ўсміхаецца. Дослед закончан. Ускоў з нейкай гордасцю разглядае толькі што атрыманае рэчыва, што «нарадзілася» вось тут, на яго вачах.

Старанна даследуюць нафтапрадукты студэнты Шаўцоў і Кананюк. Упэўнена працуюць рэбяты, але не ўсё адразу атрымліваецца добра і гладка. Ды толькі не адступаюць хлопцы перад няўдачамі. Яны ўпарта прадаўжаюць доследы, пакуль не дабіваюцца свайго. Перамога, хоць, праўда, і зусім маленькая, нарэшце, атрымана. Юнакі з задавальненнем глядзяць на хімічныя прылады, і лёгкая ўсмешка кранае іх абліччы.

**В. САЛАНОВІЧ.**

## „Каляндар студэнта“

Усе мы прывыклі новы дзень, а тым больш новы год, пачынаць з лістка календара. Адны адрываюць лісток і даведаўшыся аб тым, ці павялічыўся ўжо дзень пасля сонцастаяння, спяшаюцца да станка, у аудыторыю, да рабочага стала. Другія яшчэ з вечара ці на тыдзень запісалі ў лісток перакіднога календара што думаюць яны зрабіць у наступны дзень. І за ўсімі гэтымі выдатнымі глыбока-чалавечымі прывычкамі паўстаюць людзі—гаспадары свайго жыцця, бо толькі чалавек усведамляе, што час—гэта тая матэрыя, з якой выткана яго жыццё, бо толькі савецкаму чалавеку поўнасцю падпарадкуецца час, а паэт нашага пакалення ўсклікнуў: «Час, уперад!»

Выдаюцца і выпускаюцца ў свет розныя календары. Яны заклікаНы палегчыць людзям мэтазгоднае злічэнне часу, зрабіць усю іх дзейнасць больш насычанай і мэтанакіраванай. Нельга не вітаць таму выпуск Дзяржтэхвыдавецтвам Украіны «Календара студэнта на 1955-56 навучальны год». Старонкі календара ў многіх графах пустыя—яны чакаюць свайго напаўнення ў жыцці і запаўнення запісамі яго ўладальнікам. Ад іх студэнт пяройдзе да раздзелу «Самастойная работа студэнта», у якім агульныя палажэнні дапаўняюцца графікам абавязковых дамашніх работ на вясенні і асенні семестры, датамі здачы заданняў па розных відах вучэбных заняткаў і графікамі выканання курсавой або дыпломнай работы.

У раздзеле «Студэнцкія навуковыя гурткі» пададзены вытрымкі з «Палажэння аб навукова-даследчай рабоце студэнтаў у вышэйшых навучальных установах», а ў раздзеле «Спорт» —класіфікацыя спартыўных разрадаў і графік індывідуальных спартыўных заняткаў.

Шкада, што рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў гэтым выданні не пашанцавала. Між тым, трэба было-б замест вельмі кароткага спісу выкарыстанай літаратуры даваць пры складанні календара літаратуру да кожнага раздзела звыш тых звестак, якія ў ім паведамляюцца.

Аднак не забудзем таго, што перад намі вельмі своеасаблівае выданне, якое хаця і прыгожа пераплецена ў каленкор, запрашае чытача дапаўняць і пашыраць яго штодзённымі запісамі і запрашае карыстацца ім, як запісной кніжкай, усіх тых, каму падпарадкуецца час. Тут і запісы аб прачытаных кнігах, і кароткія вытрымкі з іх, і заметкі аб наведванні тэатраў, музеяў, выставак, кіно, і, нарэшце, самае галоўнае—штодзённыя запісы аб самастойнай акадэмічнай, паліт ыка-выхаваўчай і культурна-масавай рабоце студэнта. Думаецца, што калі гэтыя 77 старонак календара пачнуць запаўняцца студэнтамі не за страх, а за сумленне, калі пачнецца сур'ёзны ўлік часу і разлік сваіх сіл, тады нашы вытворчыя нарады і нашы комсамольскія сходы будуць больш змястоўнымі, а нашы студэнты ў надыходзячым 1956 годзе выйграюць у галоўным—у часе.

Адным словам, Кіеўскае выдавецтва падаравала нашаму студэнцтву вельмі карысны і цікавы падарунак. Не сувенір, якім упрыгожыш палічку кніг, а спадарожніка і—пры дзейсным выкарыстанні яго—компас у руху па часе ў тую пару, калі чалавек рызыкуе растраціць некалькі маладых год безЗмястоўна.

**Д. ФАКТАРОВІЧ.**

## ЭКЗАМЕНЫ ЗДАДЗІМ ПАСПЯХОВА

З асаблівым хваляваннем рыхтуюцца да экзаменацыйнай сесіі першакурснікі. Кожнаму з іх хочацца прысці да сесіі як мага лепш падрыхтаваным. Пазней як звычайна студэнты заседжваюцца ў бібліятэках, яшчэ і яшчэ раз правяраюць свае веды, імкнуцца да таго, каб яны былі трывалымі.

На I курсе гістарычнага факультэта адбыўся комсамольскі сход, які абмеркаваў пытанне аб падрыхтоўцы да зімовай сесіі. У сходзе прынялі ўдзел выкладчыкі і студэнты-выдатнікі старшых курсаў.

Выступленні комсамольцаў сведчаць аб тым, што большасць студэнтаў курса з усёй сур'ёзнасцю адносіцца да вучобы. Студэнты Налівайка, Пашкевіч, Напрэеў расказалі сабраўшымся, як яны рыхтуюцца да экзаменаў.

Студэнтка III курса Грушэўская і студэнт V курса Петрыкаў у сваіх выступленнях далі рад каштоўных парад першакурснікам.

Выкладчыкі тт. Баранава, Нікольская і Якуб выказалі задавальненне ходам падрыхтоўкі да сесіі на I курсе гістарычнага факультэта.

**І. СЯРГЕЕЎ.**
**сакратар комсамольскага бюро I курса гістфака.**

## КОМСАМОЛЬСКАЯ ГРУПА ПЕРАД СЕСІЯЙ

Зойдзем у кабінеты, чытальную залу, бібліятэку — усюды схіліліся над кнігамі і канспектамі студэнты, усюды ідзе напружаная падрыхтоўка да залікаў і экзаменаў.

Найлепшым паказчыкам таго, як рыхтуецца наша група да экзаменацыйнай сесіі, з'яўляецца актыўнасць студэнтаў на семінарскіх занятках. Асабліва часта радуюць групу студэнты Трафімчык, Ткач, Шэрстнеў, Лосеў. Адказы іх прадуманыя, змястоўныя і ясныя. Хочацца адзначыць актыўнасць студэнтаў на семінарах па крымінальнаму праву (вядзе дацэнт І. І. Гарэлік) і грамадзянскаму праву (дацэнт П. І. Гаўзэ).

Амаль усе студэнты нашага курса займаюцца ў навуковых студэнцкіх гуртках, і гэта дапамагае нам найбольш дэтальна распрацоўваць многія пытанні. Упорная, удумлівая праца заўсёды прыводзіць да поспеху: пяць прац было накіравана на гарадскі агляд, а работа студэнта Платонава аднесена да першай катэгорыі.

Усе намаганні комсамольскай групы накіраваны да таго, каб як мага лепш здаць залікі і экзамены.

Не застаюцца ў нас без увагі тыя студэнты, якія ўсё яшчэ спадзяюцца здаць экзамены «штурмам», якія не хочуць разумець, што глыбокія веды патрэбны для будучай практычнай работы. Часта даводзіцца гутарыць і групоргу, і старасту, і прафоргу з такімі студэнтамі, як Бабачкін. Ён часта прапускае лекцыі, не заўсёды рыхтуецца да семінарскіх заняткаў. Такія адносіны да падрыхтоўкі да экзаменаў непакояць і абураюць комсамольскую групу. На сходах гэтыя студэнты не знаходзяць сабе падтрымкі сярод аднакурснікаў.

Але, у асноўным, наш курс прыходзіць да залікаў і экзаменаў добра падрыхтаваным. Вялікую дапамогу аказваюць нам выкладчыкі, замацаваныя за групамі. Комсамольцы курса ўпэўнены, што зімовую экзаменацыйную сесію здадуць на «добра» і «выдатна».

**А. ВОЛКАЎ,**
**комсорг II групы III курса юрфака.**

## МЫ ГАНАРЫМСЯ ДРУЖБАЙ З ВАМІ

Здаецца толькі ўчора наша невялікая група студэнтаў з Польскай Народнай Рэспублікі прыбыла вучыцца ў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя В. І. Леніна, а ўжо ў 1956 годзе мы павінны закончыць вучобу.

Першыя гады прайшлі ў напружанай працы, у барацьбе за авалоданне мовай і матэрыялам, прадугледжаным вучэбным планам. Вялікую дапамогу аказалі нам аднакурснікі, за што ім вялікае дзякуй.

Нашы чарговыя задачы ў 1956 годзе—паспяховая здача апошніх экзаменаў, абарона дыпломных работ, упорная падрыхтоўка да дзяржаўных экзаменаў.

Пасля сканчэння вучобы мы паедзем на работу ў сваю краіну, якая будуе фундамент соцыялізма. Але мы вас, сябры, не забудзем ніколі!

Студэнцтва былой буржуазна-памешчыцкай Польшчы пасля сканчэння ВНУ было асуджана на беспрацоўе або на работу не па спецыяльнасці. Перад намі-ж, сучаснымі маладымі спецыялістамі, адкрыты шырокія дзверы дзейнасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Дзякуючы дружбе паміж Польскай рэспублікай і Совецкім Саюзам нам прадаставілася магчымасць вучыцца ў яго ВНУ. І мы ганарымся гэтым.

Запэўняем, Вас, сябры, што пасля звароту на Радзіму аддадзім усе веды і сілы на карысць будаўніцтва шчаслівай будучыні—соцыялізма.

З Новым годам, да новага шчасця, дарагія сябры!

**Студэнты-выпускнікі БДУ з Польскай Народнай рэспублікі:**
**В. ЮЗВЮК, А. СЕМЯНЮК, Б. ЧАЧУГА, М. ТАРАСЕВІЧ, В. ДРОНЬ, Э. ГЖОНДЗЕЛЯ.**

## У КАЛЕКТЫВЕ ДРУЖНЫХ

...Сход праходзіў цікава, кожнаму хацелася пагаварыць аб набалелым. Гаварылі аб вучобе і дысцыпліне, неабходнасці паляпшэння арганізацыйнай работы ў новым навучальным годзе.

...Дадому комсамольцы III курса аддзялення геалогіі разыходзіліся познім вечарам. З аудыторыі, дзе праходзіў комсамольскі сход курса, накіраваліся да раздзявалкі. Хтосьці, яшчэ не паспеўшы астынуць ад палемічнай узрушанасці, з захапленнем гаварыў свайму таварышу:

— А ведаеш, мы правільна зрабілі, што выбралі ў комсамольскае бюро Пушчына, Кісліка і Леўкова!

— Безумоўна, правільна, — адказаў другі.—Рэбяты добрыя, працаваць будуць, ды і вучыцца лягчэй, калі калектыў згуртаваны. А яны, вось пабачыш, зробяць наш курс дружным.

Студэнты не памыліліся. Калі ў мінулым годзе аб цяперашнім III курсе аддзялення геалогіі на факультэце адзываліся вельмі скромна і стрымана, то цяпер аб ім гавораць як аб самым дружным і згуртаваным калектыве факультэта. Справа, праўда, не толькі ў тым, што на курсе цікава і добра праводзяцца вечары адпачынку, жыва і па-дзеламу праходзяць комсамольскія сходы. Тут кожны член комсамольскага бюро добра ведае жыццё сваіх комсамольцаў, цікавіцца, як яны праводзяць свой час, як рыхтуюцца да практычных заняткаў.

Вось і зараз група старанна рыхтуецца да надыходзячай сесіі, да экзаменаў па структурнай геалогіі і бурэнню.

— Падручнікаў па гэтых прадметах няма, — гаворыць Ігар Пушчын, комсорг курса, таму стараемся працаваць у поўную сілу на лекцыях, на практычных занятках. Добрасумленна рыхтуемся да семінараў па палітэканоміі, практычных заняткаў па петраграфіі і геафізіцы.

Амаль усе студэнты III курса аддзялення геалогіі любяць палітэканомію. Можа таму ў іх заўсёды многа жадаючых выступаць на семінарах. Зусім нядаўна, напрыклад, у другой групе, дзе праходзіў семінар па палітэканоміі, таварыша, які выступаў першым, дапаўняла пяць студэнтаў, і ўсе давалі ясныя і грунтоўныя адказы.

На курсе многа студэнтаў, якія на працягу трох год вучобы не толькі самі добрасумленна вучацца, але і дапамагаюць, калі трэба, сваім таварышам. Гэта — Ігар Пушчын, Люба Сібілёва, Уладзімір Лісіца, Анна Красаўцава і многія іншыя.

У гэтыя апошнія перад сесіяй дні студэнты III курса аддзялення геалогіі ўвесь вольны ад заняткаў час аддаюць падрыхтоўцы да экзаменаў, каб іх здаць толькі на «добра» і «выдатна».

## Страчаныя ілюзіі

Вы не ведаеце, як Сеня Старацелеў здаваў экзамен па замежнай літаратуры? Дык слухайце. Гэта было зімой 195.. Вось не ўспомню, ці то 53, ці то 54 года. Аднак год тут не адыгрывае ніякай ролі, бо падобнае здараецца амаль штогод.

Час тады быў такі-ж, як і зараз: трашчалі марозы, вецер круціў, насіў па вуліцах снег, па вузкіх калідорах універсітэта блукалі задуменныя постаці студэнтаў. Куды ні кінь позірк—усюды кнігі, раскрытыя канспекты, ва ўсім адчувалася набліжэнне экзаменацыйнай сесіі. Сеня Старацелеў, у той час студэнт III курса аддзялення журналістыкі, сядзеў у чытальнай зале, абклаўшыся кнігамі. Заткнуўшы вушы рукамі, ён дачытваў апошнія старонкі «Спартака» Джаваньёлі. Выгляд у Сені быў даволі пануры: ускалмачаныя рыжаватыя валасы, схуднелыя шчокі, пачырванеўшыя вочы. Гэтыя эпітэты ясна гаварылі аб тым, што Старацелева ў чытальнай зале не было, што ён ваяваў недзе ў радах храбрых гладыятараў Спартака.Ніхто з навакольных і здагадацца-б не мог у гэты момант, якія ваенныя здольнасці тояцца ў Сені. Эх, чаму Сеня не жыў 2000 гадоў таму назад! Як-бы ён быў карысны Спартаку. Магчыма нават, што бясстрашны правадыр гладыятараў разам са Старацелевым атрымаў-бы перамогу над рабаўласніцкім Рымам. А так вось небарака загінуў...

Сеня закрывае кнігу і вяртаецца да рэчаіснасці. Вакол сумныя, задуменныя твары. Ніводнай усмешкі!.. Усе вучаць, вучаць...

Старацелеў уздыхае, позірк яго вачэй упіраецца ў стопку раманаў і апавяданняў, узятых сёння ў бібліятэцы. Усё гэта трэба прачытаць. Сеня бярэ ў рукі адну кнігу. «Нарысы бурсы» Памялоўскага. Яна невялікая, усяго толькі 200 старонак. Кажуць, нават цікавая. Але Старацелеву пасля «Спартака» ні за што не хацелася брацца. Падпёршы рукамі шчаку, ён уставіўся на вісеўшы ля ўваходу у залу гадзіннік. Стрэлкі паказвалі два. Хутка трэба было ісці на лекцыі.

«Час...,—думаў Старацелеў. — Як ён хутка ляціць. Не паспееш азірнуцца, а поўдня і няма... што я паспеў зрабіць... Прачытаў

# ДА ВЫНІКАЎ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ СЕСІІ

У адрозненне ад усіх астатніх курсаў юрфака на IV курсе зімовая экзаменацыйная сесія пачалася значна раней—26 лістапада, і да 18 снежня закончылася.

Экзаменацыйная сесія прайшла на высока арганізаваным узроўні і ў дзелавой абстаноўцы. Расклады кансультацый і экзаменаў рабіліся з улікам пажаданняў студэнтаў, і адхіленняў ад іх не было.

На сесію былі вынесены чатыры дысцыпліны: дыялектычны матэрыялізм, дзяржаўнае права буржуазных краін, крыміналістыка і калгаснае права.

Вынікі сесіі паказалі, што пераважная большасць студэнтаў падышла да яе з усёй сур'ёзнасцю, упорна працавала не толькі ў дні падрыхтоўкі да экзаменаў, але і на працягу ўсяго навучальнага года.

Так, напрыклад, з агульнага ліку студэнтаў 14,6 працэнта здалі экзамены толькі на «выдатна», 69,8 працэнта — на «выдатна» і «добра».

Сярод выдатнікаў—тт. Суздалева, Кузіна, Ханенка і некаторыя іншыя, якія спалучаюць вучобу з актыўнай грамадскай работай.

Нізкую, у параўнанні з іншымі дысцыплінамі, пасляховасць студэнтаў выявілі экзамены па дыялектычнаму матэрыялізму. Часткова гэта тлумачыцца тым, што асноўны матэрыял па гэтаму прадмету студэнты прайшлі ў мінулым навучальным годзе, а экзамен здавалі толькі ў сесію 1955—1956 навучальнага года.

Аднак асноўная прычына заключаецца ў тым, што некаторая частка студэнтаў несур'ёзна падышла да вывучэння гэтай важнейшай дысцыпліны, спадзеючыся, відаць, што ў вызначаныя для падрыхтоўкі да экзаменаў дні можна нагнаць упушчанае. У выніку 9 чалавек атрымалі здавальняючыя, а 2—нездавальняючыя адзнакі.

Вялікі папрок можна зрабіць члену КПСС тав. Белацаркоўскаму, які атрымаў здавальняючыя адзнакі, членам ВЛКСМ Лотніку, Вараб'ёву, Міхалоўскаму, Сазінаву, якія атрымалі на сесіі нездавальняючыя адзнакі.

Вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі важныя не толькі для студэнтаў самога IV курса. Грамадскія арганізацыі факультэта, студэнты I, II і III курсаў павінны зрабіць з іх правільныя вывады, каб зразумець усю шкоду і памылковасць поглядаў некаторых студэнтаў, быццам да сесіі можна падрыхтавацца ў перыяд яе правядзення, упорная-ж работа на працягу ўсяго навучальнага года—неабавязкова.

Неабходна ўлічыць і яшчэ адну акалічнасць: першая сустрэча з экзамінатарам з'яўляецца ў той-жа час і апошняй, іменна тут і канчаткова ацэньваюцца веды студэнта, ніякіх размоў аб пераздачы ў перыяд сесіі быць не можа. Гэта з дастатковай яснасцю зразумелі студэнты IV курса.

Студэнты I, II, III курсаў павінны ўлічыць гэтую акалічнасць і прыкласці ўсе сілы, каб за час, які яшчэ застаўся, грунтоўна падрыхтавацца да зімовай сесіі і здаць экзамены толькі на «добра» і «выдатна».

**В. МАТУСЕВІЧ,**
**сакратар партыйнага бюро юрыдычнага факультэта.**



**На здымку:** *кандыдат навук В. А. Кікаць прымае экзамен па дзяржаўнаму праву буржуазных краін у студэнта IV курса юрфака Ф. Ханенкі.*

**Фота Л. БОНДАРА.**

### *Новагодняе апавяданне*

«Спартака»,—і ўсё. А яшчэ на чарзе «Отец Горио», «Страчаныя ілюзіі» Бальзака, «Очерки бурсы» Памялоўскага, «Рыбакова хата» Якуба Коласа, пасля трэба яшчэ што-небудзь прачытаць Дзікенса, Рашэтнікава, Дастаеўскага, Янкі Купалы, Кузьмы Чорнага, Лынькова... Як многа...

Сеня ў адчаі схапіўся рукамі за галаву:

І чаму толькі не ўлічваюць магчымасцей студэнтаў пры складанні графіка экзаменаў? Гэта-ж толькі падумаць: здаваць адразу тры літаратуры! Цікава, ці ведалі пры гэтым, колькі трэба прачытаць тэкстаў да экзаменаў па іх...

Як? Вы кажаце, што і ў вас цяпер такое-ж становішча? За дзень трэба прачытваць па 200—300 старонак. І экзамены хутка ...Вы нават на лекцыях чытаеце кнігі...

Так і Сеня Старацелеў чытаў! Ды яшчэ як... Не вёў канспектаў ні па аднаму прадмету. Глытаў па паўтары кнігі за дзень... І да пачатку сесіі ў галаве ў яго быў сапраўдны сумбур. Ён так зачытаўся, што не памятаў толкам зместу ніводнага рамана. Бальзака Сеня блытаў з Дастаеўскім, Салтыкова-Шчэдрына з Кандратам Крапівой...

Перш чым расказаць, як Сеня здаваў экзамены, я вам па сакрэту паведамлю, што ён спадзяваўся атрымаць пасля экзаменацыйнай сесіі павышаную... Як ні кажыце, а 25 працэнтаў прыбаўкі што-небудзь значаць ў жыцці студэнта.

І вось, нарэшце, доўгачаканы першы экзамен—зарубежная літаратура. У гэты дзень Сеня устаў позна. Не спяшаючыся апрануўся, стаў снедаць, прыслухоўваючыся да размоў сваіх сужыцеляў па пакоі. Яны (у большасці філолагі) спрачаліся аб другой кнізе М. Шолахава «Паднятая цаліна».

— «Вось шчаслiўцы,—падумаў Сеня,—А я за поўгода не прачытаў ніводнай навінкі савецкай літаратуры...»

Экзамінатар сустрэў Старацелева ветліва (яны ўжо былі знаёмы трэці год). Білет папаўся лёгкі. Я ўжо не памятаю які. Сеня хутка на яго даў адказ. Усё ішло добра. І мабыць ў Сенявай заліковай паявілася-б пяцёрка, калі-б на стале ў выкладчыка не аказаўся раман Онорэ дэ Бальзака «Страчаныя ілюзіі».

— Так, малады чалавек,—сказаў экзамінатар, акідваючы Сеню добрым позіркам,—апошняе пытанне: скажыце, чым канчаецца раман «Страчаныя ілюзіі»?

Старацелеў, доўга не думаючы, бадзёра адказаў:

— Люсьен дэ Рубарэ ноччу ў мяцеліцу ідзе на магілу сваёй маці...

— Што?! — у выкладчыка ад здзіўлення акуляры з'ехалі на кончык носа.

Сеня зразумеў, што зрабіў нейкую памылку. Збянтэжаны, ён некалькі мінут маўчаў.

Потым сказаў:

— Не памятаю...

Так у першы-ж дзень экзаменацыйнай сесіі рухнулі Сенявы надзеі на павышаную стыпендыю.

**А. КІЙРАНЕН.**

*АГЛЯД ДРУКУ*

## „Хутка сесія! Рыхтуйцеся да яе!"

Пад такім агульным загалоўкам вышаў чарговы нумар газеты «Совецкі хімік».

У газеце змешчан артыкул дацэнта Г. А. Лазеркі «Краіне патрэбны спецыялісты». Тав. Лазерка дае матэрыял па метаду кантрасту. Калі студэнты IV курса Шаўцоў, Панкоў, Станкевіч і Кананюк рацыянальна выкарыстоўвалі кожную мінуту на працягу семестра, то і кантрольныя работы іх самыя лепшыя. Наадварот атрымліваецца ў студэнтак Шут, Дзерачэнек, Мілавацкай, якія, паводле слоў выкладчыка, займаліся «пустымі размовамі».

Ёсць у газеце і змястоўная падборка інфармацый «У лабараторыях» і цікавая заметка студэнткі Шчарбаковай «Калі няма дысцыпліны».

Рэдакцыя вельмі своечасова выступіла па гэтаму важнаму пытанню. Але нумар газеты мог-бы мець яшчэ большае мабілізуючае значэнне, калі-б усе яго матэрыялы былі поўнацэннымі. У некаторых з іх мала або зусім няма канкрэтных фактаў, слаба разгорнута крытыка недахопаў. Амаль ні аднаго факта, ні аднаго прозвішча студэнтаў не ўказана ў артыкуле студэнткі Лявонавай «Будзем рыхтавацца цяпер», які стаіць на месцы перадавіцы. Мала гэтага, ён напісан вельмі слаба ў граматычных і стылістычных адносінах. Вось два першыя сказы: «Ужо адзін месяц застаўся да сесіі. Што такое сесія, ведаюць усе студэнты, за выключэннем першакурснікаў, для якіх гэта будзе першая сесія». Тры разы паўтараецца слова «сесія», ды і, наогул, фраза нічога не гаворыць і гучыць прымітыўна. Вельмі слабыя вершыкі пад малюнкамі, змешчанымі ў раздзеле «Хромавая сумесь».

Рэдакцыя павінна больш сур'ёзна адносіцца да праўкі аўтарскіх і сваіх карэспандэнцый. Трэба патрабаваць ад аўтараў больш грунтоўных матэрыялаў, тады газета стане сапраўдным баявым органам дэканата і комсамольскай арганізацыі.

**Ул. ХМЯЛЬНІЦКІ.**

## З КОМСАМОЛЬСКІМ АГАНЬКОМ

Розныя шляхі прывялі сённяшніх студэнтаў ва універсітэт. Адны прышлі пасля сканчэння школы, другія ўжо мелі за плячыма немалы жыццёвы вопыт. Да такіх належыць і студэнт II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Вася Максімовіч.

Скончыўшы дзесяцігодку, ён працаваў у родным калгасе, служыў у Совецкай Арміі. І вось Васіль зноў узяўся за падручнікі, паступіў у ВНУ. Нялёгка было спачатку. Але Васіль не любіць гаварыць аб гэтым.

— Чаго там, — усміхаецца юнак.—Вучы, працуй, дык яно не так і цяжка.

А працуе ён нямала. У дзевяць гадзін раніцы яго заўсёды можна бачыць у чытальнай зале з кнігамі і сшыткамі. Ніколі ён не прыходзіць непадрыхтаваным на семінарскія заняткі. Цяпер В. Максімовіч старанна рыхтуецца да залікаў і экзаменаў. Ён прачытаў неабходную літаратуру, зрабіў выпіскі, якія спатрэбяцца яму пры падрыхтоўцы да заліку.

Часта Васілю прыходзіцца цяжкавата: ён-жа выконвае і немалую грамадскую работу. Яго выбралі ў камітэт комсамола універсітэта, ён—стараста групы, займаецца ў навуковых гуртках дыялекталогіі і беларускай літаратуры. Але Максімовіч не скардзіцца і паспявае ўсюды. Працуе ён з аганьком, аддае рабоце ўсё сваё ўменне і сілы.

— Патрабавальны таварыш,— кажа пра яго аднакурсніца Ніна Лук'янцава і, падумаўшы, дадае:—да ўсіх, асабліва да сябе. Мы ў яго можам шмат чаму павучыцца.

І калі мы запыталіся ў Грышы Барадуліна, чаго-б хацелі аднакурснікі пажадаць Васілю ў Новым годзе, ён адказаў:

— Толькі самага найлепшага ва ўсім. І няхай ніколі не гасне ў ім той комсамольскі аганёк, з якім ён жыве!

**Г. ПЯТРОЎ.**

# Нашы планы на будучы год

*Выкладчыкі кафедр агульнай фізікі і электрафізікі прысвяцілі свае даследаванні вывучэнню праблемы ўплыву пранікаючых выпраменьванняў на электрычныя і аптычныя ўласцівасці поўправаднікоў і дыэлектрыкаў. Пры гэтым будуць выкарыстаны навейшыя метады даследавання з галіны ядзернай фізікі.*

*Кафедры фізічнай оптыкі і спектральнага аналізу будуць прадаўжаць распрацоўку комплексных тэм, над якімі навуковыя работнікі гэтых кафедр працавалі ў бягучым годзе.*

*Вялікая частка супрацоўнікаў кафедры геаметрыі займецца вывучэннем рознастайных праблем неэўклідавай геаметрыі. Шэраг цікавых з пункту гледжання практыкі і тэорыі задач будуць распрацоўваць члены кафедры тэарэтычнай фізікі. Вялікая ўвага будзе ўдзелена выкананню доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.*

*У 1956 годзе павінны закончыць доктарскія дысертацыі дацэнты Я. В. Ламбін і А. М. Родаў, а кандыдацкія — рад аспірантаў факультэта.*

**М. П. ХАЛІМАНОВІЧ,**
**дэкан фізіка-матэматычнага факультэта.**

* * *

*Надыходзячы 1956 год будзе для мяне адказным і напружаным. Я абавязваюся выканаць вялікую навукова-даследчую работу. Завяршу падрыхтоўку да выдання манаграфіі на тэму: «Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай мыслі ў Беларусі другой палавіны XIX веку».*

*Для «Нарысаў па гісторыі большэвіцкіх арганізацый у Беларусі», том першы, рыхтуемых інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КП Беларусі, напішу раздзел: «Барацьба за стварэнне соцыял-дэмакратычных арганізацый у Беларусі» (1883—1900 гг.).*

*Калектыў філосафаў БДУ і інстытута філасофіі Акадэміі навук БССР пад кіраўніцтвам акадэміка Г. Ф. Аляксандрава рыхтуе манаграфію «Аб філасофскіх сшытках В. І. Леніна». Для гэтай кнігі я напішу раздзел аб некаторых пытаннях гістарычнага матэрыялізма ў ленінскай працы.*

**Праф. І. Н. ЛУШЧЫЦКІ.**

* * *

*У 1956 годзе мяркую здаць у выдавецтва кнігу «Пытанні эстэтыкі ў старажытных мысліцеляў», у якой ёсць наступныя раздзелы: «Марксісцка-ленінская філасофія і эстэтыка як навука», «Аб характары аб'ектыўных законаў развіцця мастацкіх поглядаў», «Эстэтычныя прынцыпы мастацтва старажытнага Усходу», «Мастацкія помнікі старажытнай культуры на тэрыторыі народаў СССР», «Старагрэчаскія мысліцелі аб прыгожым у мастацтве і рэчаіснасці», «Філасофскія асновы і эстэтычныя прынцыпы «Паэтыкі» Арыстоцеля», «Пытанні мастацтва і эстэтыкі ў працах старарымскіх паэтаў і мысліцеляў».*

**Праф. І. В. ГУТАРАЎ.**

* * *

*У 1956 годзе я мяркую падрыхтаваць да друку сваю доктарскую дысертацыю «Станаўленне і развіццё рэалізма ў беларускай літаратуры XIX веку». Апрача гэтага буду распрацоўваць пытанні станаўлення соцыялістычнага рэалізма ў беларускай літаратуры. У прыватнасці прыступлю да працы над тэмай: «Асаблівасці крытычнага рэалізма ў дакастрычніцкай творчасці Я. Купалы і Я. Коласа і зараджэнне ў ім элементаў соцыялістычнага рэалізма».*

**Дацэнт М. Г. ЛАРЧАНКА.**

* * *

*У новым годзе будзе здан у эксплуатацыю 24-кватэрны дом для работнікаў універсітэта, пабудаваны новы інтэрнат на 1600 месц, механічная пральня ў корпусе «Б», папоўніцца пасцельны інвентар інтэрната. Ва універсітэце будзе зроблен рамонт на 600 тысяч рублёў.*

**Б. Н. БЯРЭЗІН,**
**прарэктар універсітэта па адм.-гасп. рабоце.**

* * *

*У новым, 1956 годзе кафедры хімічнага факультэта будуць праводзіць вялікую навукова-даследчую работу ў галіне вывучэння адсорбцыі і растварымасці ў залежнасці ад прыроды асяроддзя, ужывання каталізатараў у тэхнічна важных хімічных працэсах, даследаванне механізма хімічных рэакцый і сінтэза новых хімічных злучэнняў.*

*Вывучэнне гэтых праблем мае вялікае навукова-тэарэтычнае і народнагаспадарчае значэнне. Усяго па адзначаных чатырох праблемах запланавана 20 тэм, значная частка якіх вынікае з рашэнняў ліпеньскага Пленума ЦК КПСС па аказанню дапамогі прамысловасці і тэхнічнаму прагрэсу. Так, супрацоўнікамі кафедры фізічнай і калоіднай хіміі пад кіраўніцтвам прафесара М. М. Паўлючэнкі будуць праведзены даследаванні па ўмацаванню стальных і чыгунных вырабаў метадам паверхневага азота- і серанасычання і вывучэнне механізма гэтых рэакцый з дапамогай «мечаных атамаў», а таксама будзе распрацоўвацца тэма па тэрмічнаму атрыманню такіх каштоўных хімічных рэчываў, як шчолачаў на аснове хларыдаў калія беларускага месцанараджэння.*

*Кафедрай неарганічнай хіміі пад кіраўніцтвам праф. Н. Ф. Ермоленкі будзе праведзена даследаванне па павелічэнню ўтрымліваемасці гербісідаў (ядахімікатаў) на пустазеллі і хмызняках з мэтай распрацоўкі больш эфектыўных метадаў барацьбы з апошнімі, а таксама будуць праведзены даследаванні па вывучэнню саставу, раздзяленню і выкарыстанню калійных солей Беларусі.*

*Кафедрай каталіза пад кіраўніцтвам праф. Б. В. Ерафеева будзе праведзена даследаванне па атрыманню новых высокаэфектыўных каталізатараў для такіх тэхнічна важных рэакцый, як атрыманне сінтэтычнага каўчука і пластычных мас, таксама намечана вывучэнне каталітычных працэсаў перапрацоўкі нафты ў каштоўныя поўпрадукты хімічнай прамысловасці.*

**І. Г. ЦІШЧАНКА,**
**дэкан хімічнага факультэта.**

# Універсітэцкі Вожык



## РАЗВІТВАЕЦЦА З 1955

— Не пайду. Куды хочаце: на край свету, у Антарктыку, на Полюс згодзен, а ў БДУ не магу!— лементаваў Дзед-Мароз. — Мне яшчэ пажыць трэба!

— Таварыш, Дзед-Мароз!—супакойваў яго Вожык, пачынаючы ўжо выходзіць з цярпення,—ты зразумей—нельга-ж без новагодняга абходу. Нечуваная рэч! Зараз-жа збірайся ў дарогу!

— Добра табе гаварыць «у дарогу!»—ты-ж калючы, цябе нічым не праймеш, а як мне, ды яшчэ на такой высокай пасадзе? Якая-небудзь плямка на рэпутацыі—і глядзіш—прагналі з работы. Пападземся раптам на вочы работнікам універсітэцкай друкарні Дзем'яновічу або Гурвічу. Папрабавала шматтыражка іх укалоць, дык яны адказнага сакратара ледзь не з'елі. Лепш пайду ў яслі раздаваць цукеркі.

— Трус,—закрычаў абураны Вожык.—Добра, абыйдуся і без цябе. Але запамятай, мы паставім тваю персанальную справу.

Надзеўшы капялюш, ён подбегам пашыбаваў у бок Беларускага універсітэта, аблезлыя карпусы якога тырчэлі непадалёку ад прыгожых дамоў прывакзальнай плошчы. Дзень быў сонечны. Марозную цішыню парушалі толькі званкі трамваяў і гудкі аўто. Каля самага універсітэта да гэтых гукаў далучаўся яшчэ і парасячы віск, які нёсся з універсітэцкага гаража.

— Што ў вас тут?—спытаў Вожык, увайшоўшы ў памяшканне.

— Нічога асаблівага, — адказаў яму нехта з шафёраў.—Рыхтуем каўбасы пад новагоднюю закусь, —і ён кінуўся лавіць вялізную свінню, якая нібы ашалелая вішчала і бегала вакол аўтамабіля.

Некалькі шафёраў тут-жа смалілі і растрыбушвалі акрываўленыя свіныя тушы.



— А дзе-ж ваша начальства?

— Няма,—адказаў Вожыку другі шафёр, стараючыся спіной прыкрыць уваход у нейкую яму. Але Вожык паспеў ужо і туды заглянуць. У пячоры, утульна размясціўшыся, сядзеў загадчык гаража Зайцаў, паглыбіўшыся ў кнігу.

— Навошта ён туды залез? — пацікавіўся Вожык.

— Ведаеце, Зайцаў-жа вучыцца ў вячэрняй школе і тут у рабочы час рыхтуе ўрокі. Зручна і бяспечна, а мы заўсёды адказваем, што загадчык гаража быў, але толькі што вышаў.

— Разумна, — згадзіўся Вожык.—А гэта што за чалавек? Тут ён паказаў на панурую фігуру ў капелюшы і паліто, якая размахвала рукамі і аб чымсьці журботна прасіла шафёраў.

— Прадстаўнік фізмата,—коратка адказваў шафёр.—Трэба з Масквы даставіць аналітычную машыну, падарунак Маскоўскага універсітэта, але ў нас, як заўсёды, няма бензіну.

— Куды-ж вы яго падзелі?

— А вы паглядзіце пуцёўкі. 20 лістапада галоўны бухгалтар у Ракаў на кірмаш па бульбу ездзіў, 28 лістапада касір Быстрык—у Заслаўскі раён па ўсялякую жыўнасць... І так увесь час. Начальства-ж, ведаеце, любіць заўсёды эканомію, дык яго цэны на Мінскім кірмашы не задавальняюць. Бывае, мы самі ўсім гаражом наладжваем экспедыцыю па свіней. Дык дзе-ж тут бензіну на ўсё набярэшся?!

— А ці бухгалтэрыя не кантралюе пуцёўкі? І хто іх выпісвае па такіх маршрутах?

— Ніхто не выпісвае, мы-ж самі ўсе пісьменныя і пішам кожны для сябе.

— Што за агіднасць!—ускіпеў Вожык.—Зараз-жа пайду да галоўбуха.

Галоўбух апошнія дні быў не ў настроі. Нядаўна пасланая на кірмаш у Бараўляны машына вярнулася з трывожнай весткай—яйкі падаражэлі на цэлы рубель за дзесятак. Вожык забег у бухгалтэрыю якраз у той момант, калі галоўбух вырашаў найсур'ёзнейшае пытанне: куды лепш накіраваць трохтонку па масла і шпік—у Кішынёў ці Палтаву?

— Справы гаража мяне не датычацца, — сярдзіта адказаў ён Вожыку і, уцягнуўшы галаву ў плечы, уеўся вачамі ў паперу.

— Пайду да рэктара,—наважыў Вожык, і патрусіў па шырокіх калідорах і лесвіцах, залітых святлом сонца і электрычнасці.





— Чаму ў вас святло ўдзень гарыць?—спытаў ён у тэхнічнага работніка, які выпадкова трапіўся яму на шляху.

— А вы не хвалюйцеся, у нас перавыдатку энергіі няма. Удзень пагарыць—затое ўвечары не запальваем. Увечары, калі прыдзеце да нас, то захапіце з сабой кішэнны ліхтарык.

У прыёмнай рэктара Вожыка затрымала важная асоба — сакратар-машыністка Н. Якушава.

— Чаго табе трэба?!— уставіўшы ледзяныя вочы, запытала яна.

— Я... Я... ведаеце... Але як яшчэ раз глянуў на раз'юшаны твар Якушэвай, усе пытанні, з якімі думаў звярнуцца да яе Вожык, мігам вылецелі з яго галавы.

— Ну і цаца... Колькі год пражыў такой грубіянкі не бачыў,— падумаў Вожык і пайшоў далей.

Ішлі заняткі. З бліжэйшай аўдыторыі даносіўся голас лектара. Вожык на цыпачках падыйшоў да дзвярэй і заглянуў у шчылінку. Студэнты III курса аддзялення журналістыкі ўважліва слухалі і канспектавалі. Толькі Барташук і Чарнова нешта перашэптваліся ды перакідваліся запіскамі. Вожык прыгразіў ім лапкай і, зачыніўшы дзверы, пайшоў у партком.—Незнарок па дарозе ён наступіў на нагу студэнтцы Але Стук, якая, як і заўсёды, спазнілася на заняткі і цяпер блукала па калідорах.

Раптам Вожык спыніўся. На яго насоўвалася нейкая грамада. Хутка ён даведаўся, што гэта студэнты 3 курса беларускага аддзялення «забаўляюцца» на перапынку.



Вожык накіраваўся ў чытальную залу, дзе запатрабаваў гадавую падшыўку часопіса «Маладосць». Яму была падана танюсенькая папка з трыма нумарамі.

«Не, не буду зараз гаварыць з бібліятэкарам,-- рашыў Вожык, — пайду лепш у сталовую падмацуюся».

У гардэробе ён заўважыў, што ў падкладцы яго новенькага паліто з'явілася дзірка.

— Ваша паліто,—паясніла гардэробшчыца,—мабыць вісела побач з паліто студэнта Уладзіміра Мілеўскага: у яго з кармана заўсёды тырчыць фінка. Кажа, што яна патрэбна яму на ўсялякі выпадак.



У цесным падвальчыку пад хімкорпусам, дзе размясцілася студэнцкая сталовая, было малалюдна. «Мне боршч, біткі і аладкі, калі ласка»,—папрасіў Вожык буфетчыцу. Адпаведныя чэкі былі выбіты ўмомант.

— А хлеб?

— Хлеб на стале. Ешце на здароўе, колькі хочаце.

— А як-жа вы за яго спагоніце грошы?

— Вельмі проста. Да кожнага блюда дадаем кошт 150 грамаў хлеба. Напрыклад, вы ўзялі тры блюды—мы і вылічым з вас за 450 грамаў.



— Але-ж не толькі мне, ды і слану, бадай, такой порцыі не з'есці, а студэнту і паловы хопіць.

— Не разважайце, даражэнькі. Яда ў нас не вельмі багатая. Хлеб—асноўнае блюда.

Сапраўды, калі Вожык убачыў, як нізенькі повар бруднымі ручкамі вылаўлівае з падлівы біткі, то апетыт у яго адразу знік. Калупнуўшы разы два відэльцам прасяную кашу, якая пахла мылам, ён пажаваў скарынку хлеба і накіраваўся да выхаду.

— Заўсёды вас так кормяць?— спытаў ён студэнта у спартыўнай форме, які, купіўшы хлеба, вышаў разам з ім.

— Заўсёды,—адказаў той. Бывае і горш. Давайце, таварыш Вожык, заглянем да нас у спартыўную залу. Пабачыце трэніроўку баскетбалістаў. Праўда, зала ў нас цеснаватая і душа няма. Так што пасля трэніроўкі мы падобны да трубачыстаў. І на лыжную базу таксама раіў-бы зазірнуць: цікава працуе. Падумайце— парай паломаных лыж абслугоўвае ўсіх жадаючых пакатацца.

У спартыўнай зале, праўдзівей, у пакоі, ішлі заняткі. Работа трэнера Е. Анкуды была нескладаная. Пры ўдалым браску мяча ў сетку ён крычаў—«малайчына», а пры дрэнным— «балван».

— А колькі вам плоцяць за такую работу?—пацікавіўся Вожык. Але лексікон трэнера, таксама як і лексікон аднаго з гараднічых горада Глупава, мабыць, абмяжоўваўся, толькі двума гэтымі словамі, а таму ён нічога і не адказаў.



Ужо цямнела, калі Вожык вышаў са спартыўнай залы. Лёгкі ветрык узнімаў снежны пыл. Вокны інтэрнатаў былі ярка асветлены. У пакоях, відаць, ішла дзейсная падрыхтоўка да сустрэчы Новага года.

Пайду і я дахаты, рашыў Вожык, і, уявіўшы сабе на хвіліну святочны стол, застаўлены бутэлькамі, стаў лагодна ўсміхацца ад задавальнення. Але перш чым выйсці з тэрыторыі універсітэцкага гарадка, ён прыгразіў студэнтам Шабовічу і Крукаву, якія біліся ля пад'езду інстытута народнай гаспадаркі з швейцарам, імкнучыся няпрошанымі госцямі пралезці на інстытуцкі вечар.

Ля інтэрната на вуліцы Свердлова Вожык раптам убачыў Дзеда-Мароза, які сядзеў на балконе трэцяга паверха.

— Што ты там робіш, стары?— закрычаў ён.

— Пры выкананні прамых абавязкаў,—адрапартаваў Дзед-Мароз прастуджаным голасам і паказаў на акно, праз якое былі бачны аспіранты Шаціла, Паўленка і Пяткевіч, якія сядзелі ў паліто і ляскалі зубамі ад холаду.—Там батарэя маленькая и не грэе. Вось і даводзіцца дзяжурыць, нават цукерак раздаць дзецям не магу адыйсці.

— А ты аспірантам скажы няхай яны скачуць. На свята трэба-ж патанцаваць. А то дзеці застануцца без падарункаў.

— Добра,— радасна закрычаў Дзед-Мароз і, падаўшы знак Шаціле і Паўленку, хуценька спусціўся ўніз і пайшоў побач з Вожыкам.

— Гэта праўда, калючы, што ты патрабуеш вынясення мне спагнання?—спытаў Дзед-Мароз Вожыка пасля некаторага маўчання.

— Безумоўна,—адказаў той сурова.—І не толькі табе, але і яшчэ некаторым...

**С. АЛЯКСАНДРАЎ.**



## Навагоднія сны

*Калі апоўначы ўсе землі*
*Абходзіць ціха Новы год*
*І ў новых зорах небазвод,—*
*Маўкліва інтэрнат наш дрэмле,*
*І яму сніцца слаўны сон.*
*Нібы нарэшце, у Новым годзе*
*Ён дачакаўся лепшых дзён—*
*Выкладчыкі ў яго заходзяць,*
*Прыходзяць кожны дзень дэканы,*
*Дацэнт—стары і малады,*
*Прафесар нават паважаны*
*Заглянуў неяк раз сюды.*
*Яны заходзяць у пакоі,*
*Усё прыкмеціць іх пагляд,*
*Ва ўсё ўнікаюць з непакоем,*
*На кухню заглянулі на'т.*
*Разважылі глыбокадумна,*
*Чаму студэнтам часам сумна,*
*Далі цікавых шмат парад...*
*Сніць сон салодкі інтэрнат.*
*...І ў інтэрнаце—сонны рай.*
*Прысніў цудоўны сон Бадзяй*
*(Ён з курса першага фізмата),*
*Што ў Новым годзе ён адзін*
*Не нейкіх шэсцьдзесят гадзін,*
*Як у мінулым прапусціў,*
*А цэлых трыста шэсцьдзесят.*
*Ён рэкардсмен — усім наўздзіў,*
*Ім ганарыцца ўвесь фізмат,*
*І прыпіслі яму студэнты*
*І лаўры, і апладысменты.*
*Што-ж, будзем верыць, што, бадай,*
*Не спраўдзіць гэты сон Бадзяй.*
*І сон такі-ж, крыху трывожны,*
*Гісторык—Лукашэвіч сніць,*
*І з юрыдычнага—Пірожны.*
*Як кажуць, што граха таіць,—*
*У старым годзе любіў кожны*
*Заняткі часта прапусціць.*
*...А вось Сасноўскай з біяфака*
*І журналістцы Барташук*
*Сон сніўся без трывогі ўсякай*
*І без усякіх розных мук.*
*Ім снілася, наадварот,*
*Што прынёс радасць Новы год,*
*Што паработаўшы прылежна,*
*Яны экзамен па замежнай*
*Здалі, хаця і са спазненнем,*
*І што з вялікім здавальненнем*
*Яны на мове на чужой*
*Гавораць, як і на сваёй...*
*...А курсу трэцяму філфака*
*Прысніўся проста цуда-сон:*
*Што ў іх у групе ўсё ў парадку,*
*Што ў іх часта, як закон,*
*Бывае час палітзаняткаў*
*Пад кіраўніцтвам Шакуна*
*(Заўвага будзе тут адна—*
*Шакун ў старым, мінулым годзе*
*Не вёў работы—ды і годзе).*
*І як ні дзіўна, сон такі-ж*
*З'явіўся ў начную ціш*
*І другакурснікам філфака.*
*І толькі ў гэтым сне адна*
*Свая маленькая адзнака—*
*У ім, заместа Шакуна,*
*Таварыш Дорскі быў, аднака,*
*Жаданне ў іх было адно:*
*Палітзаняткі пад сукно...*
*...А вось прысніла шматтыражка*
*Што ўваходзіць з папкай важкай*
*Булацкі. Паглядзеў наўкол—*
*І свой артыкул—бац на стол:*
*«На вецер слоў я не кідаю,*
*Усё зраблю, што абяцаю».*
*А з камітэта спіць таварыш*
*У позе дзіўнай, вось якой:*
*З пакутлівым, бядача, тварам,*
*З уверх узнятаю рукой.*
*Забыць паседжанні ён хоча,*
*Але аб іх напомніў сон,*
*І нават новагодняй ноччу*
*Па звычцы галасуе ён.*
*У гэтым пяць разоў на тыдні*
*Яго комсорг трэніраваў,*
*Але ў сне і то не відна*
*За гучнай фразай добрых спраў.*
*Ды твар святлее задуменны,*
*Усмешкай засвяціўся ён:*
*Сну непрыемнаму на змену*
*Прышоў другі, цудоўны сон.*
*Эх, і чаму гэта не ява!*
*Чаму-б і праўда не вісець*
*На камітэце той аб'яве:*
*«Закрыт. Пайшлі у групы ўсе.»?!*
*І вось, зірніце-ка, хто гэта:*
*Пад галавой—паперы ліст?*
*Над новагодняю газетай*
*Заснуў стамлёны журналіст.*
*І бачыць ён (ну хто-б падумаў!):*
*Да «Журналіста» не прайсці.*
*Тут столькі спрэчак, столькі шуму!*
*І смех—хоць на хвіліну-б сціх!*
*Імкнецца Герус непрыкметна*
*Хаця-б схавацца за каго:*
*Нарэшце крытыкай газета*
*Нядрэнна прыпякла яго.*
*Бягуць з хімфака і гістфака*
*Артыкул пачытаць ці верш*
*І прызнаюць бясспрэчным фактам,*
*Што не знайсці газеты лепш.*
*Не будзем-жа будзіць студэнта.*
*Хай ён дагледзіць гэты сон,*
*Бо да канца сваю газету*
*Хіба што ў сне чытае ён.*
*«Ратуйце, браткі, небараку!*
*На дапамогу ўсе сябры!»*
*Загаласіў хтось на юрфаку,*
*Нібыта нешта там гарыць.*
*Ажно вахцёр тут прахапіўся,*
*Ды хутка крык страшэнны сціх,*
*Бо гэта Дудкіну прысніўся*
*Сон, непрыемней ад усіх.*
*Як тут стрымаешся, не крыкнеш*
*(Хоць гэта толькі нейкі сон),*
*Калі к яму прышоў вялікі*
*Натоўп «душ мёртвых» на паклон.*
*І кожны з іх прынёс паперы.*
*А там напісана (бяда!)*
*Што ён для іх у поўнай меры*
*І сакратар і ўладар.*
*А ён не бачыў іх ніколі.*
*І жах яго ажно трасе,*
*Калі з усіх бакоў паволі*
*Яны к яму ідуць усе.*
*Хто іх сапраўдныя намеры*
*Цяпер сумее адгадаць?*
*І хто тут Дудкіну паверыць,*
*Што ён не іхні уладар.*
*Яны ўсе бліжай падыходзяць...*
*І ён, прачнуўшыся, рашыў,*
*Што мець не будзе ў Новым годзе*
*Ён мёртвай ні адной душы.*

**А. ВЯРЦІНСКІ,**
**Г. БУРАЎКІН.**

Рэдактар **А. ВОЛК.**


АТ 06 808. Мінск. Друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 855 Тыраж 2 000.